**Пазакласнае чытанне. КВЗ “Падарожжа ў краіну казак Алеся Якімовіча”**

*Мэта:стварэнне ўмоў для цеснага супрацоўніцтва і садружнасці, станоўчага псіхалагічнага настрою.*

*Задачы: развіваць інтэлектуальныя здольнасці, уменне прымяняць атрыманыя веды ў адпаведнай сітуацыі;абуджаць цікавасць, павагу і любоў да роднага слова; садзейнічаць умацаванню адносін паміж бацькамі і дзецьмі, праз сумесную творчую працу.*

Добры дзень, дзеці! Добры дзень, паважаныя бацькі! (Прыслухоўваецца.) А ці добры у вас настрой?

Але я чамусьці чую нейкі плач!

(З’яўляецца верабей і плача.)

Верабей: Ціў-ціў-ціў, што ж гэта за гора!

ВЯДУЧЫ: Чаго ж ты так плачаш, верабейка?

Верабей: Як жа мне не плакаць. Не хоча былінка мяне калыхаць . Я падумаў наслаць на яе коз, ды зусім забыўся як яны выглядаюць. Мая суседка сініца дала мне вось гэты малюнак, ды я не знайду такую казу. (Паказвае малюнак.)

ВЯДУЧЫ: Не плач, верабейка , мне здаецца, што мы табе зможам дапамагчы. А вы, дзеці, зразумелі чаму не знайшоў верабейка такую казу? Чаго у яе няма?

ДЕЦІ: Хваста!

ВЯДУЧЫ: Вось мы і прымацуем яго казе. У мяне якраз ёсць вось такі хвосцік. Ліда мне дапаможа правільна размясціць яго на малюнку. Вось і ўсё.

Верабей: Дзякуй вам, паважаныя. Зараз я хутка знайду гэтых козаў. (выбягае)

ВЯДУЧЫ: А ці ведаеце вы з якой казкі гэты рухавы верабейка?

ДЕЦІ: Былінка і верабей.

ВЯДУЧЦЫ: А хто напісаў гэтую казку?

ДЗЕЦІ: Гэта беларуская народная казка.

ВЯДУЧЦЫ: Так, гэта беларуская народная казка ў апрацоўцы Алеся Якімовіча.

І сёння мы з вамі адправімся ў падарожжа ў краіну беларускіх народных казак.

**<u>Звесткі пра аўтара.</u>**

Нарадзіўся Алесь Іванавіч Якімовіч на Уздзеншчыне, у вѐсцы Чурылава, 17 студзеня 1904 года. Рана стаў пастушком, дапамагаў бацьку па гаспадарцы. У школу пайшоў, калі споўнілася 8 гадоў. Асабліва спатрэбілася Алесева навука, калі аднавяскоўцаў пачалі прызываць на Першую сусветную вайну. Ён чытаў салдацкія пісьмы з фронту, пісаў адказы на іх. Ды не пакідала мара – працягваць вучобу. Пасля кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года, скончыўшы сямігодку і двухмесячныя настаўніцкія курсы, Алесь Якімовіч паехаў у Мінск і паступіў вучыцца ў беларускі педагагічны тэхнікум. Потым закончыў Беларускі Дзяржаўны універсітэт.

Сваю першую кніжку для дзяцей Алесь Якімовіч выдаў у 1925 годзе – зборнік апавяданняў —”Гул бубна”.

У яго апрацоўцы асобнымі выданнямі выйшла шмат беларускіх казак, якія былі з любоўю сабраныя і апрацаваныя. Казкі, сталі залатым скарбам роднай літаратуры. Казкі, якія вучаць любові да сваей зямлі, да людзей, вучаць мудрасці і дабрыні ўсіх, хто аднойчы захоча пабываць у іх дзівосным свеце.
Пісьменніка даўно ўжо няма . Ен пайшоў з жыцця 15 студзеня 1979 года, не дажыўшы ўсяго два дні да свайго 75-годдзя. Але засталася добрая памяць пра яго. На радзіме імем пісьменніка Алеся Якімовіча названа Зенькавіцкая сярэдняя школа. Засталіся з намі кнігі – духоўная спадчына гэтага выдатнага майстра слова і чалавека, чараўніка-казачніка з краіны нашага маленства.
З чагопачынаеццасонечныдзень? Вядома, з новайказкі.
У казках і грушырастуць на вярбе.
Грамацевучыцьваронасароку.
Гавораць, знайшоўсяадзінверабей,
Штовозеравыпіўу спёку.
Казкісеюцьзернемудрасці — так кажуць у народзе. А хто не захапляўсяімі? Я, думаю, што такіх няма.У падарожжа ў Краіну беларускіх народных казак апрацаваных А. Якімовічам адпраўяцца сем’і: сям’я Паўлючык, у складзе Мікіты і яго мамы Анжалікі Францаўны; сям’я Браўко, у складзе Максіма і яго таты Андрэя Васільевіча; сям’я Брылевіч, у складзе Анастасіі і яе мамы Ганны Уладзіміраўны; сям’я Дубковых, у складзе Дар’і і таты Андрэя Міхайлавіча (мамы Наталлі Іванаўны); сям’я Сурковых, у складзе Данііла і мамы Ірыны Мікалаеўны.
Нас чакаюць прыгоды, выпрабаванні і спаборніцтвы. А для таго, каб наша спаборніцтва было цікавым, дапаможа ў гэтым журы.

***1 Конкурс “З якой казкі?”***

1. Пачулі лісіцыны дочкі музыку і кажуць:
   - Як хораша нехта іграе. (“Коцік, пеўнік і лісіца” )
2. – Ат, - замахала крыламі пчала, - няма калі з табою гаманіць. (“Пчала і муха”)
3. – А цяпер бяры мяне на паляванне. Я табе зайцоў і птушак буду лавіць. ( Верабей і мыш”)
4. Козы ж не паслухалі.
   - Пачакайце ж, козы, нашлю на вас ваўкоў. (“Былінка і верабей”)
5. – Цяпер напаі.
   - А як жа я цябе напаю?
   - А вунь, бачыш, чалавек бочку з півам вязе. ( “Лісіца і дрозд”)
6. – Сячы сабе. Я цябе не баюся!
   - Хто цябе навучыў так гаварыць? (“Дзяцел, лісіца і варона”)
7. – Ці маеш ты розум, шаноўны Тук Туковіч! ( “Сава і дзяцел”)
8. – Гэта толькі дурныя заморскія птушкі зганілі мяне. (“Ганарыстая варона”)

9. Пайшлі вяроўкі стральцоў вязаць – і цяпер вяжуць. (“Былінка і верабей”)
10. Жылі дзед і баба. Дзед у лес хадзіў дровы секчы, а баба дома была, пірагі пякла. ( “Лісіца і дрозд”)

***2 Конкурс “Дай параду”***(Запіс на картцы. Удзельнікі прачытваюць пра сябе, рыхтуюцца, затым чытаюць для ўсіх і даюць параду герою казкі).

**<u>1 герой</u>**

“Цэлымі днямі сяджу дома, абед вару, сябра чакаю. Але кожны раз са мною здараецца непрыемная гісторыя: даю слова сябру, зачыняю дзверы і мяне перахітраюць.

Што ж мне рабіць? “

Хто гэта ? з якой казкі? (Коцік, пеўнік і лісіца”)

**<u>2 герой</u>**

Аднаго разу лісіца мне кажа:

- Цяпер пацеш ты мяне.

А я ёй у адказ:

- Як жа я йябе пацешу?

Ліса мне расказала, як патрэбна ўсё зрабіць. Паслухаў я яе і паляцеў на ток. Там дзед з бабаю гарох малацілі. Я сеў на лоб бабе. Дзед цэпам не па мне, а бабе па ілбе. Потым я сеў дзеду на лоб – баба дзеду па ілбе цэпам. Я садзіўся то бабе на лоб, то дзеду, а яны малацілі адзін аднаго. Мая сяброўка качалася ад смеху. Дзед з бабаю набілі гузакоў, а мне ходзь бы што – паляцеў у лес пасвістваючы.

Якую параду можна даць гэтаму герою? (“ Лісіца і дрозд”)

**<u>3 герой</u>**

Навокал было так ціха, і сон да мяне пасля працоўнага дня прыйшоў салодкі, што мне нават жукі-караеды перасталі сніцца. І раптам я пачуў страшэнны рогат. Я спужаўся і задрыжаў. Калі працёр вочы, дык зразумеў хто мяне напужаў. Але я не застаўся ў даўгу. Старанна стукаў увесь дзень, не даваў пакою лупавокай, якая напужала мяне ноччу. Так і пайшло дзень пры дні, ноч пры ночы. Ні я, ні лупавокая з таго часу не можам спаць спакойна.

(“Сава і дзяцел”)

**<u>4 герой</u>**

Узрадавалася я ад пахвалы і завяла на ўсю ваколіцу сваю песню.

Калі скончыла спяваць, гляджу – а рака і след прастыў. Давялося мне галоднай зноў на сметнік да сяброvak ляцець.

(“Ганарыстая варона”)

**<u>5 герой</u>**

Надакучыла нам так жыць. Задумалі я і мой сябар ляда капаць, збажыну сеяць. Ускапалі ладную дзялянку, пасеялі пшаніцу. Я ў сябра пытаю: - Што будзе тваё, карэнне ці вяршкі?”

Ён не ведаў, што ўзяць, але я падказала каб браў карэнне. Сама ж я ведаю, дзе смак. ("Верабей і мыш")

***3 конкурс "Алеська"*** . А гульня "Алеська" дапаможа нам выявіць самых руплівы і хуткіх (для дзяцей).

УМОВЫ ГУЛЬНІ: У цэнтры круга стаіць два стулы, а на іх ляжаць фартухі? Усе дзеці становяцца ў шарэнгу за вядучым. У гуляючых рукі на поясе. Удзельнікі ідуць па кругу з такімі словамі: "Ты, Алеська, не зявай, не зявай, не зявай! Фартух хутка надзявай, надзявай, надзявай!" Як толькі вядучы скажа: "Алеська!",- гуляючыя павінны падбегчы да месца, дзе ляжаць фартухі, адзець. Удзельнікаў 5, а фартухоў – 4.

***4 конкурс"Казачны кошык".***Гульня для бацькоў. Мы з вамі згуляем у гульню, якая называецца "Казачны кошык".

УМОВЫ ГУЛЬНІ: Усе гуляючыя становяцца ў круг. Гучыць музыка і кошык перадаецца з рук у рукі. Калі музыка змаўкае, то той, хто застаўся з кошыкам у руках выбывае з гульні. Гульня прадаўжаецца да тых пор, пакуль не застанецца адзін гуляючы. Ён і лічыцца пераможцам гэтай гульні.

***5 конкурс"Замяні адным словам"***

Казка быццам лясная крыніца:
Калі хоць слова не зразумець,
Не будзе крыніца іскрыцца,
Не будзе яна звінець.

У некаторых казках сустракаюцца спалучэнні слоў, значэнне якіх трэба растлумачыць. Вось, напрыклад: Шмыгнула мышка ў норку і як у ваду канула. Адкуль у норцы з'явілася вада? Ці мышы жывуць у вадзе? Дапамажыце зразумець сэнс словазлучэння як у ваду кануць. Як замяніць яго адным словам? (Прапасці, знікнуць, згінуць.)

Патлумачце іншыя словазлучэнні:
даць дзёру — пусціцца наўцёкі;
збіць з панталыку — заблытаць;
як на дражджах — хутка, шпарка;
вадзіць за нос – падманваць;
Зарубіць на носе –запомніць.

***6 конкурс "Прыказка"***

Народ усё прымячае і ў прыказку складае. Людзі скажуць — што ў вузел звяжуць.

А вы памятаеце прыказкі і прымаўкі? Я пачынаю, а вы працягвайце:
Адзін у полі не... (воін).
Хто рана ўстае, той... (многа зробіць).
Як кот шкадлівы, а як заяц... (баязлівы).
Дзякуй, як дасі, а калі не дасі, то й сам... (не прасі).

Сам сябе не хвалі, няхай людзі... (пахваляць)
(З прапанаваных слоў скласці прыказку, словы на асобных лістах , кожная прыказка ў канверце).
Лепш адзін прыяцель, як дзесяць ворагаў.
Не той лепшы, хто бяжыць за стол першы.
У людзей пытай, а свой розум май.
Лёгка пасварыцца, цяжэй памірыцца.
Рана загоіцца, а злое слова ніколі.

***7 конкурс " Дамашняе заданне"*** (інсцэніроўка ўрыўка казкі ( на выбар).

Надышло тут нашым казкам завяршэнне,
Развітаемся мы з імі. Да пабачэння!
Дзякуем казцы за добрае слова,
Што падарыла нам родная мова.
Матчын дарунак ад самай калыскі,
За гэта ад дзетак паклон табе нізкі.

Вось і закончылася наша невялікаепадарожжа па краіне казак. Вы паказалідобрыя веды беларускіх казак. Спадзяюся, што вы з цікавасцюбудзеце і далей чытацьказкі.

***Падвядзенне вынікаў. Узнагароджванне.***

